Шчыры падарунак

НОВЫ АЎТОБУС — НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыў ключы ад новага мікрааўтобуса «ГАЗель» Уздзенскаму раённаму цэнтру карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для перавозкі дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Машына куплена за кошт раённага і абласнога бюджэтаў.

Памочнік Прэзідэнта Ігар ЯЎСЕЕЎ і дырэктар цэнтра Марына ПАЎЛОВІЧ.

Перадгісторыя гэтай падзеі наступная. На адным з прыёмаў грамадзян да Ігара Уладзіміравіча звярнулася маці, якая мае дзіця-інваліда. Жанчына паскардзілася, што машына, якая падвозіць выхаванцаў да цэнтра, часта выходзіць са строю.

— Мы вывучылі сітуацыю, я даў даручэнне начальніку ДАІ Мінскай вобласці высветліць, колькі гадоў гэтай машыне, які ў яе прабег, як часта яна становіцца на рамонт. Прааналізаваўшы ўсе параметры, зразумелі, што праблема сапраўды ёсць, аўтобус тэхнічна зношаны, — расказаў Ігар Яўсееў. — Мной і старшынёй Мінаблвыканкама Анатолем Ісачанкам было прынятае рашэнне аб неабходнасці набыць новую машыну.

Мікрааўтобус абсталяваны спецыяльным прыстасаваннем для замацавання інваліднай каляскі, электрычным пандусам-пад'ёмнікам, сядзеннямі з рамянямі бяспекі, месцам для суправаджаючага педагога, кандыцыянерам. А тэлевізар зробіць паездку маленькіх пасажыраў больш цікавай і захапляльнай.

— Я думаю, цяпер у дзяцей і іх бацькоў будзе праблем намнога менш. Я рады, што ў нас усё атрымалася. Сёння, наведаўшы ваш горад, яшчэ раз упэўніўся, што жыхары яго любяць, — прыемна праехацца па чыстых прыгожых вуліцах. Абмеркавалі мы са старшынёй райвыканкама і некаторыя іншыя аспекты развіцця горада і раёна. У прыватнасці, у райцэнтры няма басейна, жыхарам даводзіцца ездзіць у Стоўбцы. Будзем думаць над рашэннем, — рэзюмаваў Ігар Яўсееў.

— Мы разгледзім пытанне, каб на гэтай машыне дзеці з'ездзілі ў рэзідэнцыю Дзеда Мароза ў Белавежскую пушчу. Давайце зробім для выхаванцаў цэнтра такі навагодні падарунак, — звярнуўся ён да начальніка ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Таццяны Апраніч. — Я са свайго боку буду хадайнічаць, думаю, грошы знойдзем.

— Мы ўпэўнены, што новы аўтобус значна палепшыць якасць навучання і сацыяльнай рэабілітацыі дзяцей. А нашы ўзаемаадносіны з усімі суб'ектамі адукацыйнага працэсу выйдуць на новы ўзровень, — **сцвярджае дырэктар цэнтра Марына ПАЎЛОВІЧ.** — Новы транспарт дазволіць арганізаваць бесперабойную дастаўку дзяцей. Усяго ж у класе адзінаццаць выхаванцаў, чатыры з іх атрымліваюць спецыяльную адукацыю дома, семярых возім у цэнтр з розных населеных пунктаў раёна. Акрамя таго, нашы выхаванцы змогуць цяпер наведваць сваіх равеснікаў з Дзяржынска, Клецка, Капыля, Нясвіжа, з якімі сябруюць, праводзяць розныя мерапрыемствы, конкурсы, спаборніцтвы.

Дарэчы, установе 26 кастрычніка споўнілася 20 гадоў з дня заснавання. Так што ў педагогаў і выхаванцаў двайное свята.

Падарунак цэнтру — мікрааўтобус.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. Фота БелТА.

«АЛЕСІ» — 95!

Сёння часопіс «Алеся», які выходзіць у нашым Выдавецкім доме «Звязда», адзначае 95-годдзе выхаду першага нумара. Рашэнне аб стварэнні менавіта жаночага часопіса было прынята на I Усебеларускім з'ездзе работніц і сялянак у сакавіку 1924 года. Часопіс, які некалькі дзесяцігоддзяў насіў назву «Работніца і сялянка», быў папулярны і любімы не толькі ў Беларусі, але і ў іншых саюзных рэспубліках.

Са слаўным юбілеем выданне павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што за гады існавання часопіс некалькі разоў мяняў назву, але не страціў сваёй сутнасці. Як і дзесяцігоддзі таму, ён паспяхова спрыяе паляпшэнню становішча жанчын у грамадстве, паказвае іх як актыўных удзельніц палітычнага, сацыяльнага і культурнага жыцця краіны.

«Не будзе перабольшаннем сказаць, што «Алеся» сфарміравала некалькі пакаленняў беларусак — энергічных, адукаваных і адказных. Выданне і сёння робіць важкі ўнёсак у стварэнне светлага, высакароднага вобраза беларускай жанчыны, выхаванне нашай моладзі і папулярызацыю сямейных каштоўнасцяў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што творчы калектыў часопіса і надалей будзе верны сваім прафесійным абавязкам і добрым традыцыям. Ён пажадаў аўтарам і чытачам «Алесі» шчасця, дабрабыту і далейшых поспехаў на карысць роднай Беларусі.

Надвор'е

ВОСЬ І СНЕГ НА ГАЛАВУ

А ў пятніцу — з плюсам

У пачатку тыдня ўмовы надвор'я ў нашай краіне будзе вызначаць заходняя перыферыя антыцыклону з цэнтрам над сярэдняй Волгай, а разам з гэтым захаваецца халоднае без істотных ападкаў надвор'е.

А ў сярэдзіне тыдня надвор'е пачне мяняцца, і тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам атмасферных франтоў і цёплых паветраных мас, якія паступаюць з Заходняй Еўропы. Тэмпературны фон пачне павышацца, чакаюцца ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, месцамі туман і слабыя галалёдныя з'явы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Заўтра ў сераду ў асобных раёнах Беларусі чакаюцца невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Амаль паўсюдна слабы туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 8 градусаў па ўсходзе да плюс 1 градуса па паўднёвым захадзе краіны, удзень — ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла. Таксама мокры снег з дажджом чакаецца і ў чацвер. Іх прынясуць да нас атмасферныя франты ўначы ў асобныя раёны, а ўдзень — на большую частку тэрыторыі краіны. Месцамі магчымыя слабы туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы — ад нуля да мінус 6 градусаў, а ўдзень — ад мінус 2 да 4 цяпла. Па паўднёвым захадзе краіны ўначы будзе 1—3 цяпла, удзень — ад плюс 5 да плюс 7 градусаў. У пятніцу часова пацяплее. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, уначы і раніцай па паўночным усходзе чакаюцца дождж, мокры снег і слабы галалёд. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад нуля да плюс 5 градусаў, толькі ўначы па паўночным усходзе пры праясненнях панізіцца да мінус 3 градусаў. Разам з тым удзень па паўднёвым захадзе краіны будзе 6—8 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу на большай частцы Беларусі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, які будзе пераходзіць у мокры снег. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман, удзень чакаецца парывісты вецер. Тэмпература паветра удзень — ад мінус 1 градуса па паўночным захадзе краіны да плюс 5 градусаў па паўднёвым усходзе.

Сяргей КУРКАЧ.

Ну і ну!

Пасажыр цягніка пабіўся з касірам

І паражаў нажом міліцыянеру

Удзень у Жабінкаўскі РАУС паступіла паведамленне: у электрычцы Брэст — Баранавічы п'яны мужчына збівае білетнага касіра.

Канфлікт завязаўся пасля таго, як 45-гадовы пасажыр адмовіўся аплачваць праезд. Слоўная сварка скончылася бойкай, пасля якой безбілетнік выйшаў на станцыі Жабінка. Аператыўнікі Брэсцкага АУС на транспарце ўстанавілі асобу пасажыра і ўвечары таго ж дня прыехалі да яго дадому для ўдакладнення абставін таго, што адбылося.

Калі праваахоўнікі зайшлі ў кватэру, гаспадар пачаў іх абражаць, а затым схапіўся за кухонны нож. Сышчык дастаў табельную зброю і папярэдзіў пра намер яе выкарыстаць. Гэта спыніла мужчыну, ён раскаяўся ў зробленым і расказаў падрабязнасці таго, што адбылося ў цягніку. Цяпер праводзіцца праверка па факце гвалту альбо пагрозы яго прымянення ў дачыненні да службовай асобы, а таксама па факце гвалту альбо пагрозы яго прымянення ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў.

Вядома, што безбілетнік ужо трапляў у поле зроку супрацоўнікаў міліцыі і неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за дробны крадзеж, з'яўленне ў грамадскім месцы ў стане алкагольнага ап'янення і парушэнне ПДР.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Папа Рымскі сустрэўся ў Токіа з імператарам Японіі

Папа Рымскі Францыск, які знаходзіцца з візітам у Японіі, сустрэўся ў панядзелак у Токіа з імператарам Японіі Нарухіта, перадае тэлеканал NHK.

Японскі імператар, адзеты ў чорны еўрапейскі гарнітур з гальштукам, выйшаў да машыны сустрэць пантыфіка, які прыбыў у палац, а пасля заканчэння сустрэчы праводзіў яго да аўтамабіля. Нарухіта стаў імператарам Японіі 1 мая гэтага года, пасля таго, як яго бацька Акіхіта перадаў яму трон у спадчыну. Раней Францыск выступіў з прамовай у Нагасакі і заклікаў свет адмовіцца ад ядзернай зброі. Пасля Нагасакі ён накіраваўся ў Хірасіму, на якую ўпершыню ў свеце ў 1945 годзе была скінутая ядзерная бомба. Гэта першае наведванне Францыскам Краіны ўзыходзячага сонца, папярэдні візіт кіраўніка каталіцкай царквы ў Японію адбыўся 38 гадоў таму.

Часовы прэзідэнт Балівіі падпісала закон аб усеагульных выбарах

Часовы прэзідэнт Балівіі Жанін Аньес падпісала закон аб усеагульных выбарах, прыняты напярэдадні абедзвюма палатамі парламента краіны, які адмяняе вынікі кастрычніцкіх выбараў і вызначае парадак і тэрміны правядзення новых. «З-за гэтага закона мы выйшлі на вуліцы», — заявіла падчас выступлення ў палацы Кемада палітык, словы якой прыводзіць Балівійскае інфармацыйнае агенцтва. Максімальны тэрмін, вызначаны законам для правядзення новых прэзідэнцкіх выбараў у Балівіі, складае 140 дзён: 20 дзён дэпутаты адвялі на выбары вярхоўнай калегіі Вышэйшага выбарчага суда і дадатковыя 120 — на арганізацыю і правядзенне галасавання, якое павінна прайсці не пазней за 12 красавіка. У тлумачэнні да законапраекта, апублікаваным сенатам Балівіі, гаворыцца, што ён забараняе выстаўляць свае кандыдатуры на выбарах асобам, якія раней займалі гэтую пасаду два тэрміны запар. Такім чынам, становіцца юрыдычна немагчымым удзел у маючых адбыцца выбарах экспрэзідэнта краіны Эва Маралеса.

Грамадзянін Малайзіі павешаны ў Сінгапуры за спробу ўвозу 16 грамаў наркотыкаў

У Сінгапуры прыведзены ў выкананне смяротны прысуд, вынесены грамадзяніну Малайзіі за кантрабанду наркотыкаў. Мужчыну судзілі пасля таго, як у яго канфіскавалі 16,56 грама гераіну. 36-гадовага Абд Холм Абд Халіма пакаралі смерцю праз павешанне ў галоўнай турме «Чанг», піша The Star. Іншаземец быў арыштаваны на граніцы, на сухапутным пагранічным пераходзе, у сакавіку 2017 года. Апошняе прашэнне аб памілаванні было адхілена сінгапурскім судом у ліпені гэтага года. На гэтым тыдні міністр у дэпартаменце прэм'ер-міністра Малайзіі па пытаннях юрыспрудэнцыі Лі Ву Кіёнг накіраваў уладам Сінгапура ноту з просьбай перагледзець гэтае рашэнне, аднак зварот застаўся без адказу. Памілаваць Халіма беспаспяхова прасіў і міністр юстыцыі Малайзіі. Незаконны абарот наркотыкаў з'яўляецца адным з найцяжэйшых злачынстваў у Сінгапуры, адзначае ТАСС. Паводле мясцовага заканадаўства, найвышэйшая мера пакарання пагражае за захоўванне, транспартаванне 15 грамаў гераіну або 30 грамаў какаіну.

К СВЕДЕНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БелВитунифарм»

Внеочередное собрание акционеров состоится 17 декабря 2019 года в 12.00 по адресу: Витебская область, Витебский район, д. Должа, ул. Советская, д. 26А, актовый зал. Регистрация участников будет осуществляться по указанному выше адресу, время регистрации участников собрания пройдет в день проведения собрания с 9.00 до 11.45. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность. Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 1 декабря 2019 г.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ

	Формулировка вопроса повестки дня
1	О создании дочернего торгового унитарного предприятия Общества на территории Российской Федерации
2	Об участии в обществе с ограниченной ответственностью на территории Республики Казахстан
3	О создании филиала Общества в г. Минске Республика Беларусь
4	О внесении изменений и дополнений в устав Общества

С материалами внеочередного собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник – пятница), начиная с 2 декабря 2019 г., по месту нахождения Общества в кабинете начальника отдела правовой и кадровой работы с 08.00 до 16.00.

Наблюдательный совет ОАО «БелВитунифарм». Тел. 8 0212 209390.

УНП 811001710

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне вядучаму рэдактару рэдакцыйнага ўпраўлення Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Ксюк Валянціне Леанідаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.